9(476)(075.6)
Ж-949

А. П. Жытко,
В. М. Фамін

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ
## (1945—2002 гг.)



Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

*А. П. Жытко, В. М. Фамін*

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ
# (1945—2002 гг.)

*Вучэбны дапаможнік*

УК 2148
Бібліятэка
БДПУ імя М.Танка

Мінск 2004

УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(2)622я73
Ж11

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ
Рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук БДПУ
(пратакол № 10 ад 10.02.04)

*Рэцэнзенты:*
У. Н. Сідарцоў, доктар гістарычных навук, прафесар;
С. В. Паноў, кандыдат педагагічных навук

**Жытко А. П., Фамін В. М.**
Ж11 Гісторыя Беларусі (1945—2002 гг.): Вучэб. дапам.— Мн.: БДПУ, 2004.— 135 с.
ISBN 985-435-747-3

У дапаможніку асвятляецца гісторыя Беларусі ад заканчэння Вялікай Айчыннай вайны да пачатку XXI ст. Дапаможнік пабудаваны па праблемна-храналагічным прынцыпе. У ім разглядаюцца пытанні аднаўлення эканомікі БССР, якая была амаль поўнасцю знішчана падчас вайны, далейшага сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця рэспублікі на падставе яе буйнамаштабнай мадэрнізацыі. Значная ўвага ўдзяляецца грамадска-палітычнаму жыццю ў Беларусі ў гэтыя гады, набыццю ёю поўнага суверэнітэту, стварэнню новай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь.

Адрасуецца студэнтам і выкладчыкам гістарычнага факультэта БДПУ.

**УДК 947.6 (075.8)**
**ББК 63.3 (2)622я73**

ISBN 985-435-747-3

© А. П. Жытко, В. М. Фамін, 2004
© ВВЦ БДПУ, 2004

# ЗМЕСТ

**АД АЎТАРАЎ** ........ **4**

**Раздзел I. ПЕРАХОД ДА МІРНАГА ЖЫЦЦЯ. ВЫЗНАЧЭННЕ НАПРАМКУ РАЗВІЦЦЯ (1945—1953 гг.)** ........ **5**

Асноўныя кірункі аднаўлення Беларускай ССР у пасляваенныя гады ........ 5

§ 1. Пераадоленне разрухі ў эканоміцы. Выхад на новы ўзровень развіцця ........ 6

§ 2. Грамадска-палітычнае жыццё ў аднаўленчы перыяд ........ 12

§ 3. Адраджэнне і развіццё адукацыі і навукі ........ 15

§ 4. Літаратура і мастацтва ў першыя пасляваенныя гады ........ 19

Вынікі аднаўлення і развіцця БССР у пасляваенныя гады. Пытанні і заданні ........ 24

ДАКУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ ........ 25

**Раздзел II. БССР У 1953—1964 гг. КУРСАМ РЭФОРМ** ........ **35**

Неабходнасць адыходу ад сталінскай мадэлі кіраўніцтва краінай ........ 35

§ 1. Першыя спробы дэмакратызацыі грамадства ........ 36

§ 2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у новых умовах ........ 40

§ 3. Дэмакратызацыя ў культуры Беларусі ........ 44

Вынікі развіцця Беларусі ў 1953—1964 гг. Пытанні і заданні ........ 48

ДАКУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ ........ 50

**Раздзел III. ЗАПАВОЛЕННЕ ТЭМПАЎ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ. ПРАЯЎЛЕННЕ КАНСЕРВАТЫЗМУ (1965—1984 гг.)** ........ **52**

Беларускае грамадства ва ўмовах мапарухомага дваццацігоддзя ........ 52

§ 1. Новае ў грамадска-палітычным жыцці краіны ........ 53

§ 2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 1965—1984 гг. ........ 56

§ 3. Культурна-нацыянальнае жыццё рэспублікі ........ 60

Дасягненні і праблемы развіцця Беларусі ў 1965—1984 гг. Пытанні і заданні ........ 66

ДАКУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ ........ 68

**Раздзел IV. БССР НА ШЛЯХУ ДА СУВЕРЭНІТЭТУ (ДРУГАЯ ПАЛОВА 80-х — ПАЧАТАК 90-х гг. XX ст.)** ........ **73**

Беларусь ва ўмовах пошуку шляхоў мадэрнізацыі сацыялізму ў СССР ........ 73

§1. Эканамічнае становішча Беларусі ва ўмовах аслаблення цэнтралізаванага кіравання ........ 74

§ 2. Змены ў грамадска-палітычным жыцці краіны ........ 78

§ 3. Ад БССР да Рэспублікі Беларусь. Набыццё суверэнітэту ........ 82

§ 4. Нацыянальна-культурнае Адраджэнне ў суверэннай Беларусі ........ 86

§ 5. Выхад Беларусі на міжнародную арэну ........ 90

Вынікі нацыянальна-дэмакратычных пераўтварэнняў на рубяжы 80-х — 90-х гг. Пытанні і заданні ........ 95

ДАКУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ ........ 97

**Раздзел V. РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ: ШЛЯХ ДА СТАБІЛІЗАЦЫІ (1996—2002 гг.)** ........ **103**

Некаторыя вынікі выбару шляху развіцця ........ 103

§ 1. Асноўныя кірункі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь ........ 104

§2. Грамадска-палітычнае жыццё Беларусі на мяжы тысячагоддзяў ........ 108

§ 3. Культура Беларусі на мяжы стагоддзяў ........ 112

§ 4. Беларусь у сусветным супольніцтве на мяжы стагоддзяў ........ 115

Вынікі стабілізацыі Беларусі на мяжы XX—XXI стст. Пытанні і заданні ........ 119

ДАКУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ ........ 120

**ЗАКЛЮЧЭННЕ** ........ **133**

**ЛІТАРАТУРА** ........ **135**

# АД АЎТАРАЎ

*Вывучэнне гісторыі Беларусі пасляваеннага часу мае важнае адукацыйна-выхаваўчае значэнне. Нягледзячы на шматлікія цяжкасці пасляваеннага жыцця, беларускі народ у сціслыя тэрміны загаіў раны вайны, а потым дабіўся вялікіх поспехаў у далейшай мадэрнізацыі сваёй краіны і, нарэшце, праявіў палітычную волю ў забеспячэнні нацыянальнага суверэнітэту і стварэнні ўласнай дзяржавы пасля распаду СССР.*

*У вучэбным дапаможніку гэтыя лёсавызначальныя працэсы раскрываюцца на аснове асвятлення падзей, якія звязаны з сацыяльна-эканамічным, палітычным і культурным развіццём Беларусі ў перыяд ад заканчэння Вялікай Айчыннай вайны да пачатку новага, XXI ст. Увесь гэты адносна працяглы адрэзак часу храналагічна падзяляецца на 5 частак, якія называюцца раздзеламі і ў сваю чаргу складаюцца з параграфаў.*

*Кожны раздзел уключае агульную характарыстыку разглядаемага перыяду, пытанні і заданні па яго асноўным змесце. Параграфы ў складзе раздзелаў вызначаны па праблемным прынцыпе і асвятляюць асноўныя пытанні сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі на акрэсленым адрэзку гістарычнага часу. Раздзелы 4—5 утрымліваюць спецыяльныя параграфы, у якіх прадстаўлена Рэспубліка Беларусь на міжнароднай арэне. Як вядома, выхад Беларусі на міжнародную арэну быў звязаны з яе ўдзелам у заснаванні ў 1945 г. Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН) і пастаянным з таго часу членствам у ёй. Аднак рэальна дзейнасць Беларусі ў ААН не была самастойнай, паколькі ўсё вызначалася ў Маскве. І толькі з набыццём незалежнасці ў 1991 г. Рэспубліка Беларусь атрымала рэальны статус паўнапраўнага члена міжнароднай супольнасці. У дапаможніку асвятляецца як працэс набыцця гэтага статусу, так і дзейнасць рэспублікі ў знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай сферах. Кожны параграф заканчваецца пытаннямі і заданнямі, якія служаць як для самаправеркі атрыманых ведаў, так і для самастойнай працы студэнтаў па паглыбленым вывучэнні гэтага перыяду гісторыі Беларусі.*

*Пры разглядзе канкрэтных пытанняў у параграфах і ў канцы іх пры неабходнасці прыводзяцца вытрымкі з дакументальных крыніц. У канцы раздзелаў змяшчаюцца найбольш важныя дакументы і матэрыялы, значная частка якіх адносіцца да перыяду існавання Рэспублікі Беларусь у якасці незалежнай дзяржавы. Іх наяўнасць паспрыяе ўдакладненню праблем, якія разглядаюцца ў дапаможніку, і дазволіць студэнтам набываць навыкі самастойнай працы з гістарычнымі крыніцамі. У канцы даецца кароткае заключэнне і спіс літаратуры*

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

*Пасляваенны перыяд гісторыі Беларусі насычаны буйнымі падзеямі, у якіх увасобіліся як працэсы ўнутранага жыцця рэспублікі, так і развіцця заходняй і сусветнай цывілізацыі. На адносна непрацяглым адрэзку часу беларускаму народу давялося прыкласці вялікія намаганні, каб перадолець разбуральныя вынікі Вялікай Айчыннай вайны і нямецка-фашысцкай акупацыі. У далейшым ён стаў міжвольным удзельнікам «халоднай» вайны і глабальнага супрацьстаяння дзвюх сусветных грамадска-палітычных сістэм. На яго долю выпала змаганне за сваю, здавалася, зусім блізкую светлую камуністычную будучыню і перажыць поўнае крушэнне гэтага міфа. У гэтых умовах новай выратавальнай надзеяй для беларускага народа стала вяртанне да сваіх гістарычных каранёў, пабудова ўласнай дзяржавы, адраджэнне нацыянальнай культуры і перш за ўсё мовы.*

*Стваральнікамі неспрыяльных умоў жыццядзейнасці краін і народаў пасля Другой сусветнай вайны з'яўляліся не самі па сабе аб'ектыўныя абставіны, а ўрады вядучых краін свету, іх кіраўнікі, палітычныя і грамадскія дзеячы. І ўсё-такі гістарычны працэс вызначалі не яны, а шырокія народныя масы як унутры кожнай краіны, так і ў сусветным маштабе.*

*Менавіта намаганнямі народа ў пасляваенныя гады ў Беларусі быў створаны буйны прамысловы комплекс, у якім налічвалася звыш 1,5 тыс. сучасных прадпрыемстваў. Шырокія маштабы набыў выпуск трактароў, аўтамабіляў, станкоў, прыбораў, электронна-вылічальных машын і інш. Значны размах атрымалі комплексная механізацыя і аўтаматызацыя вытворчых працэсаў. Пашырылася выкарыстанне станкоў з лікавым праграмным кіраваннем, станкоў-аўтаматаў, робататэхнікі. Індустрыяльнае аблічча рэспублікі вызначалі навукаёмкія галіны народнай гаспадаркі, якія адлюстроўвалі навукова-тэхнічны прагрэс. Гэта радыётэхнічная, электронная, станкабудаўнічая, аўтамабільная, нафтаперапрацоўчая, хімічная прамысловасць.*

*Аднак прамысловае будаўніцтва ў рэспубліцы ў пасляваенныя гады вялося без уліку фарміравання нацыянальна-рэгіянальных патрэбнасцей, што прывяло да сур'ёзных парушэнняў у экалагічнай сферы. Рэспубліка аказалася перанасычанай шкоднымі адыходамі ў прамысловай вытворчасці, якія забруджвалі паветра і навакольнае асяроддзе, патрабавалі дадатковых выдаткаў для прадухілення экалагічнай катастрофы. Становішча ў вобласці экалогіі асабліва абвастрылася ў сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС.*

*У буйную галіну народнай гаспадаркі пераўтварыліся будаўніцтва, транспарт і сувязь. Менш значнымі былі вынікі развіцця сельскай гаспадаркі. Аднак пэўны прагрэс у пасляваенныя гады адбываўся і ў ёй. Гэта стала вынікам шырокамаштабнага росту тэхнічнага аснашчэння кал-*

*гасаў і саўгасаў, укаранення хімізацыі і дасягненняў сучаснай аграбіялагічнай навукі.*

*Беларускія вучоныя, дзеячы культуры ўнеслі значны ўклад у развіццё многіх галін навукі, асабліва матэматыкі, фізікі, хіміі, геалогіі, фізіка-тэхнічных навук і інш. Меліся дасягненні ў развіцці літаратуры і мастацтва, паглыбленні ведаў аб беларускім этнасе, яго мове і культуры. Зразумела, што пры іншых сацыяльна-палітычных і грамадскіх умовах жыцця вынікі маглі быць больш значнымі. І не народ вінаваты ў тым, што праз 70 з лішкам гадоў камуністычнага кіраўніцтва краіна апынулася ў стане крызісу і поўнага развалу.*

*Набыццё Беларуссю дзяржаўнай незалежнасці стала для беларускага народа пачаткам новай эры ў яго гісторыі. Нягледзячы на цяжкасці пераходнага перыяду на шляху будаўніцтва новай дзяржавы і дэмакратычнага ладу жыцця, пройдзены за дзесяцігоддзе шлях пераканаўча сведчыць аб вялікіх перавагах для беларускага народа наяўнасці дзяржаўнага суверэнітэту і поўнамаштабнага міжнароднага супрацоўніцтва. Удзел народа ў будаўніцтве сваёй новай, незалежнай Бацькаўшчыны з'яўляецца асновай дабрабыту і шчаслівай будучыні Беларусі.*

## ЛІТАРАТУРА


1. Адамушка У. І. Палітычныя рэпрэсіі 20—50-х гадоў на Беларусі. М., 1994.
2. Беларусь: выбор пути. Национальный отчет о человеческом развитии, 2000. Мн., 2000.
3. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мн., 2000.
4. Беларусы: Этнаграфія, дэмаграфія, дыяспара, канфесіі: Атлас. М., 1996.
5. Беларусы. М., 1998.
6. Беларусы. Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў, В. М. Балявіна, А. У. Гурко і інш. Мн., 2002. Т. 6.
7. Верашчагіна А. У., Гурко А. В. Гісторыя канфесій на Беларусі ў другой палове XX стагоддзя. Мн., 1999.
8. Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь. Новыя канцэпцыі і падыходы: У 2 ч. Мн., 1994.Ч. 1. Гісторыя Беларусі.
9. История Белорусской ССР. Мн., 1977.
10. Касцюк М. П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мн., 2000.
11. Круталевіч В. А. На путях самоопределения: БНР — БССР — РБ. Мн., 1995.
12. Кузнецов И. Н., Шелкопляс В. А. История государства и права Беларуси. Мн., 1999.
13. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII — XX ст.) / В. В. Грыгор'ева, У. М. Завальнюк, У. І. Навіцкі, А. М. Філатава. Мн., 1998.
14. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 1996.
15. Огурцов С.С. Участие Белорусской ССР в борьбе за соблюдение прав человека. Мн., 1985.
16. Республика Беларусь в цифрах. Мн., 2002.
17. Снопковский В. Е. Белорусская ССР в ООН (1945—1985 гг.). Мн., 1985.
18. Шыдлоўскі В. Рысы майго пакалення. Мн., 2001.
19. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 1993—2003.
20. Эканамічная гісторыя Беларусі / Пад агул. рэд. В. І. Галубовіча. Мн., 1996.